# Выбары*2025. Аналітычная справаздача па выніках назірання за перадвыбарнай агітацыяй

*Экспертная місія па назіранні за выбарамі*[1] 2025 арганізаваная Беларускім Хельсінкскім Камітэтам і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Місія збірае ды аналізуе інфармацыю аб выбарчай кампаніі паводле адкрытых крыніцаў і паведамленняў ад выбаршчыкаў з Беларусі.*

## ВЫСНОВЫ

- цалкам кантраляваныя ўладамі выбары*2025, уключна з этапам агітацыі, адбываюцца ў рэпрэсіўным клімаце, ва ўмовах зачышчанага палітычнага ды інфармацыйнага поля (гл. папярэднія справаздачы кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары");
- у меж этапу агітацыі мусіла б весціся палітычная барацьба паміж кандыдатамі ў прэзідэнты, аднак у сітуацыі імітацыі канкурэнтнасці (большасць кандыдатаў не пазіцыянавалі сябе як рэальную альтэрнатыву А. Лукашэнку, а хутчэй агітавалі за яго, што добра адлюстравана ў заяве С. Сыранкова: "Не вместо, а вместе"), дзеянні ўсіх кандыдатаў, акрамя А. Лукашэнкі, які карыстаўся адміністрацыйным рэсурсам, былі практычна не заўважныя для шырокай аўдыторыі;
- патрабаванні выбарчага заканадаўства паводле забеспячэння публікацыі перадвыбарных праграм і прадастаўлення эфірнага часу на дзяржаўным радыё і тэлебачанні былі выкананыя, аднак немагчыма казаць аб роўнасці кандыдатаў у выкарыстанні СМІ; фармальна праводзіліся тэледэбаты (А. Лукашэнка, як заўсёды, адмовіўся ў іх удзельнічаць). Некаторыя выступленні кандыдатаў (А. Гайдукевіч, С. Сыранкоў) утрымлівалі прыкметы распальвання варожасці, забароненай арт. 47 ВК;

---

[1] "Выбары*" у дачыненні да выбарчай кампаніі-2025 выкарыстоўваецца кампаніяй "Праваабаронцы за свабодныя выбары" з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, паколькі любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі напоўніцу рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцый, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае

- передвыбарная агітацыя адбывалася ў няроўных умовах: у падтрымку А. Лукашэнкі быў задзейнічаны адміністрацыйны і прапагандысцкі рэсурс вертыкалі ўлады, праўладных грамадскіх арганізацый і дзяржаўных СМІ. Мы можам вылучыць некалькі механізмаў такога злоўжывання: 1) выкарыстанне адміністрацыйных ды інфармацыйных магчымасцяў, што прыкладаюцца да пасады прэзідэнта, як частка агітацыйнай кампаніі А. Лукашэнкі; 2) акцыі ў межах "Марафону адзінства" і раскрутка лозунга "Время выбрало нас!"; 3) кампанія (флэшмоб) "Надо!"; 4) інфармаванне аб выбарах у цэлым, якое выкарыстоўваецца для схаванай агітацыі на карысць А. Лукашэнкі; 5) сустрэчы давераных асоб А. Лукашэнкі, многія з якіх з'яўляюцца службовымі асобамі, з прадстаўнікамі працоўных калектываў дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстаноў, у тым ліку ў працоўны час;
- невыразная мяжа паміж выкананнем дзяржаўных абавязкаў і агітацыяй, што свядома падтрымліваліся, дазволілі А. Лукашэнку сумяшчаць афіцыйныя візіты, сустрэчы і паездкі з фактычнай агітацыяй, карыстаючыся прывілеямі шырокага інфармацыйнага абслугоўвання пасады прэзідэнта за дзяржаўны кошт; таксама прынятае А. Лукашэнкам у афіцыйнай якасці прэзідэнта рашэнне аб павышэнні пенсій падчас выбараў, можа разглядацца як подкуп выбаршчыкаў і з'яўляецца формай выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу;
- маштабная прапагандысцкая кампанія "Марафон адзінства", якая доўжылася 4 месяцы, забяспечвалася дзяржаўным фінансаваннем (сума выдаткаў ацэньваецца ў больш чым 3,5 млн. рублёў), фактычна была передвыбарнай кампаніяй А. Лукашэнкі. Лозунг передвыбарнай кампаніі А. Лукашэнкі "Время выбрало нас!" прасоўваўся з дапамогай УНС, "Марафону адзінства", штодзённага "гістарычнага" тэлепраекта "Время выбрало нас!" на тэлеканале Беларусь 1;
- імітацыя палітычнай актыўнасці і шырокай падтрымкі, а таксама дадатковыя рэсурсы на агітацыю былі атрыманыя А. Лукашэнкам дзякуючы флэшмобу "Надо!", які падаваўся як стыхійная кампанія падтрымкі А. Лукашэнкі, але меў прыкметы арганізаванага мерапрыемства, больш за тое, мерапрыемствы, да ўдзелу ў якім прымушаюць;
- гэтак жа як і на выбарах*2024, адукацыйна-асветніцкія мерапрыемствы пра выбары падмяняюць сабой жывы палітычны працэс. Але нават у межах такіх "агульных" словаў пра важнасць выбараў і пра абавязак выбаршчыкаў узяць удзел у выбарах (з акцэнтам на датэрміновым галасаванні, які захоўваўся), знаходзіцца месца для ўскоснай агітацыі за А. Лукашэнку (заявы аб правільнасці "абранага

курсу" і неабходнасці падтрымліваць "нацыянальнага лідара");

- у адсутнасць незалежныхназіральнікаў і дастатковай празрыстасці працэсу паступлення і расходавання сродкаў у выбарчых фондах кандыдатаў, ажыццявіць паўнавартаснае назіранне за фінансавым бокам выбараў немагчыма. Пры гэтым, афіцыйна заяўленыя выдаткі ўсіх кандыдатаў (уключна з А. Лукашэнкам) істотна ніжэй вызначанага ліміту ў 420 000 руб. Нават сума, выдаткаваная з фонду А. Лукашэнкі (92 032 руб.), відавочна малая для разгортвання паўнавартаснай агітацыйнай кампаніі па ўсёй краіне.

## I. ПРАВАВАЯ БАЗА

Прававое рэгуляванне этапу перадвыбарнай агітацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з палажэннямі артыкула 10 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь (ВК), артыкулаў 45 – 47.

Перадвыбарная агітацыя пачынаецца за 25 дзён да дня выбараў і завяршаецца ў 24 гадзіны дня, які папярэднічае дню галасавання. У дзень выбараў агітацыя забароненая. Такім чынам, на бягучых выбарах* перадвыбарная агітацыя адбываецца ў перыяд з 1 па 25 студзеня 2025 г. уключна.

Грамадзяне[2] Рэспублікі Беларусь, палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы і давераныя асобы кандыдатаў маюць права на свабоднае і ўсебаковае абмеркаванне перадвыбарных праграм кандыдатаў, іх палітычных, дзелавых і асабістых якасцяў.

Агітацыйныя мерапрыемствы могуць праводзіцца:

1. на сходах і мітынгах;
2. у сродках масавай інфармацыі;
3. у інтэрнэце;
4. падчас сустрэчаў з выбаршчыкамі.

Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, як пазначана ў артыкуле 45, удзел у агітацыі не бяруць.

### Давераныя асобы

Статус давераных асоб вызначаны арт. 76 ВК. Згодна з ім, кандыдат у прэзідэнты мае права прызначыць да 30 давераных асоб, што граюць ключавую ролю ў арганізацыі перадвыбарнай агітацыі.

Давераныя асобы акрамя таго, што выконваюць функцыі садзейнічання ў правядзенні выбарчай кампаніі кандыдата і прадстаўлення інтарэсаў

[2] "Грамадзянін" ды іншыя назоўнікі марфалагічнага мужчынскага роду выкарыстоўваюцца ў значэнні агульнага роду і абазначаюць усе гендары.

кандыдата ў адносінах з дзяржаўнымі органамі, грамадскімі аб'яднаннямі, выбаршчыкамі і выбарчымі камісіямі, таксама ўпаўнаважаныя весці агітацыю за абранне кандыдатаў.

Даверанымі асобамі не могуць быць кандыдаты ў прэзідэнты і сябры выбарчых камісій. Таксама арт. 46 ВК вызначае абмежаванне адносна дзейнасці журналістаў і кіраўніцтва СМІ, калі яны з'яўляюцца даверанымі асобамі: ім "забараняецца весці тэле- і радыёпраграмы, удзельнічаць у асвятленні выбараў праз сродкі масавай інфармацыі".

**Патрабаванні да кандыдатаў пры правядзенні передвыбарнай агітацыі**

У адпаведнасці з артыкулам 47 ВК, у межах передвыбарнай кампаніі забараняецца:

- **Прапаганда вайны**, заклікі да гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу і парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці краіны.
- **Абразы і паклёп** у дачыненні да службовых асоб, кандыдатаў у прэзідэнты або дэпутаты.
- Заклікі да **зрыву, адмены або пераносу выбараў** ці рэферэндуму, прызначаных у вызначаным заканадаўствам парадку.
- **Узбуджэнне сацыяльнай, расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варожасці, а таксама прапаганда любога кшталту перавагі.**

Кандыдатам, іх давераным асобам ды іншым удзельнікам передвыбарнай агітацыі забараняецца:

- Раздаваць грашовыя сродкі, падарункі ці іншыя матэрыяльныя каштоўнасці.
- Праводзіць ільготны распродаж тавараў.
- Бясплатна прадастаўляць паслугі ды тавары, за выключэннем спецыяльна выраблених агітацыйных матэрыялаў, якія адпавядаюць патрабаванням выбарчага кодэкса.

Таксама забаронена ўздзейнічаць на грамадзян абяцаннямі перадачы ім грашовых сродкаў або матэрыяльных каштоўнасцяў у абмен на падтрымку кандыдата.

ВК дапускае правядзенне некалькімі кандыдатамі сумесных сустрэч з выбаршчыкамі і мерапрыемстваў (арт. 45), але пры гэтым забараняецца агітацыя за кандыдата ў прэзідэнты, якая аплачваецца са сродкаў выбарчых фондаў іншых кандыдатаў (арт. 47).

Пры парушэнні гэтых патрабаванняў адпаведныя камісіі прымаюць захады па спыненні парушэнняў, а Цэнтральная камісія, тэрытарыяльная,

акруговая выбарчая камісія маюць права таксама адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата.

### Сустрэчы з выбаршчыкамі

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы сумесна з выбарчымі камісіямі вызначаюць памяшканні для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі. Заявы аб прадастаўленні памяшканняў падаюцца кандыдатамі, даверанымі асобамі кандыдатаў ці выбаршчыкамі не пазней чым за два дні да меркаванай даты сустрэчы.

Памяшканні прадастаўляюцца бясплатна, у парадку чарговасці паступлення заяў. У выпадку немагчымасці падаць запытанае памяшканне выбарчая камісія абавязаная прапанаваць альтэрнатыўныя варыянты. Тэрытарыяльныя, акруговыя выбарчыя камісіі ў сродках масавай інфармацыі або іншым спосабам інфармуюць выбаршчыкаў аб правядзенні сустрэч з кандыдатамі ў прэзідэнты, а таксама аб правядзенні передвыбарных сходаў, якія арганізуюцца выбаршчыкамі.

Кандыдаты ў прэзідэнты маюць права за кошт сродкаў уласнага выбарчага фонду арандаваць будынкі і памяшканні для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі. Будынкі і памяшканні для названых мэтаў прадастаўляюцца кандыдатам на роўных умовах.

### Масавыя мерапрыемствы для перадвыбарнай агітацыі

Кандыдаты ды іх давераныя асобы могуць арганізоўваць масавыя мерапрыемствы, такія як сходы, мітынгі, пікетаванні. Іх правядзенне, акрамя арт. 45-1 ВК, рэгулюецца законам "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь".

Месцы для масавых мерапрыемстваў, мэта якіх правядзенне перадвыбарнай агітацыі, вызначаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі паводле ўзгаднення з адпаведнымі выбарчымі камісіямі.

Апавяшчэнне аб правядзенні мерапрыемства накіроўваецца ў мясцовы выканаўчы орган не пазней чым за два дні да яго правядзення. У паведамленні паказваюцца мэта, выгляд масавага мерапрыемства, месца, дата, час пачатку і заканчэнне мерапрыемства, а таксама кантактныя дадзеныя заяўніка.

Забеспячэнне грамадскага парадку і бяспекі грамадзян у час правядзення масавага мерапрыемства ўскладаецца на мясцовы выканаўчы і распарадчы орган і органы ўнутраных спраў. Кандыдаты, іх давераныя асобы абавязаны садзейнічаць забеспячэнню грамадскага парадку.

Масавыя мерапрыемствы могуць праводзіцца з 8 да 22 гадзін. Забеспячэнне грамадскага парадку ўскладаецца на мясцовыя органы ўлады і органы

ўнутраных спраў.

## Выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі

Сродкі масавай інфармацыі абавязаны прадастаўляць роўныя магчымасці для агітацыі ўсім кандыдатам. Кандыдаты маюць права:

1. бясплатна публікаваць перадвыбарныя праграмы ў дзяржаўных друкаваных СМІ (уключна з тымі, што маюць 50 і больш працэнтаў акцый (долей у статутных фондах) ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь);
2. выступаць па радыё і тэлебачанні.

Пералік друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, а таксама тэлевізійныя і (або) радыёвяшчальныя сродкі масавай інфармацыі вызначаецца ЦВК. Перадвыбарчыя праграмы кандыдатаў публікуюцца ў парадку іх паступлення. Эфірны час размяркоўваецца з разліку не менш за 60 хвілін па працоўных днях апошнія 20 дзён да дня выбараў, то-бок пачынаючы з 5 студзеня 2025 г.

## Выраб і размяшчэнне агітацыйных матэрыялаў

Кандыдаты могуць вырабляць агітацыйныя матэрыялы за кошт сродкаў уласных выбарчых фондаў. Усе друкаваныя матэрыялы павінны ўтрымліваць выпускныя даныя: (найменне і адрас арганізацыі або індывідуальнага прадпрымальніка, які вырабіў матэрыялы; нумар пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі вытворцы і дату яго выдачы; наклад і нумар замовы; прозвішча і ініцыялы замоўцы).

Да распаўсюджвання такія матэрыялы або іх копіі (уключна з паменшанымі копіямі і макетамі) прадстаўляюцца кандыдатам у прэзідэнты ў ЦВК, тэрытарыяльную або акруговую камісію. Распаўсюджванне ананімных агітацыйных друкаваных матэрыялаў забаронена.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы абавязаны вылучыць найбольш наведвальныя грамадзянамі месцы на тэрыторыі ўчасткаў для галасавання для размяшчэння агітацыйных матэрыялаў. Пры гэтым:

- Забараняецца размяшчэнне агітацыйных матэрыялаў у будынках, дзе знаходзяцца выбарчыя камісіі, і ў памяшканнях для галасавання.
- Размяшчэнне ў іншых месцах дапускаецца толькі з дазволу кіраўніка адпаведнай арганізацыі. Калі адзін дазвол ёсць, іншым кандыдатам адмаўляць на тых жа ўмовах нельга.
- Выканаўчыя і распарадчыя органы могуць забараняць размяшчэнне матэрыялаў у не адведзеных месцах.

Зняцце, заклейванне, замазванне або пашкоджанне агітацыйных матэрыялаў, вырабленых і размешчаных у адпаведнасці з законам, не дапускаецца.

На ўсіх участках для галасавання не пазней чым за 14 дзён да выбараў, гэта значыць да 11 студзеня ўключна, павінны быць афармленыя стэнды з інфармацыяй пра кандыдатаў. Гэтыя стэнды застаюцца ў памяшканнях для галасавання ў дзень выбараў.

### Выбарчыя фонды

Парадак стварэння і выкарыстання выбарчых фондаў рэгулюецца арт. 48-1 ВК. У межах выбараў*2025 дзейнічае таксама зацверджанае ЦВК Палажэнне аб выбарчым фондзе асобы, якая вылучаецца кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.[3]

Выбарчыя фонды кандыдатаў у прэзідэнты фармуюцца за кошт:

- уласных грашовых сродкаў кандыдата,
- добраахвотных ахвяраванняў грамадзян Рэспублікі Беларусь, што дасягнулі 18 гадоў (ліміт – 30 базавых велічыняў на чалавека).

Пры гэтым, зыходзячы з сэнсу ч. 8 арт. 48-1 ВК, ахвяраванні могуць таксама пералічвацца юрыдычнымі асобамі. ЦВК называе[4] ахвяраванні юрыдычных асоб як трэцюю крыніцу фармавання выбарчага фонду ды вызначае ліміт – 60 базавых велічыняў ад адной юрыдычнай асобы.

Таксама вызначаны[5] пералік суб'ектаў, якім забараняецца ўносіць ахвяраванні (замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, замежныя грамадзяне, міжнародныя арганізацыі ды інш.).

Фармальна, верхняга ліміту выбарчага фонду не вызначана. Замест гэтага ўстаноўленая лімітавая сума выдаткаў са сродкаў выбарчага фонду – 10 000 базавых велічынь,[6] г. зн. 420 000 руб.

Ананімныя ахвяраванні грамадзян забароненыя.[7] ЦВК тлумачыць, што пад ананімнымі ахвяраваннямі разумеецца ахвяраванне без указання ў плацежным дакуменце любой з патрэбных[8] звестак аб грамадзяніне або юрыдычнай асобе.

Для фармавання выбарчага фонду кандыдат мае права адкрыць адзін спецыяльны выбарчы рахунак у падраздзяленні адкрытага акцыянернага таварыства "Ашчадны банк "Беларусбанк".

Нявыкарыстаныя сродкі выбарчага фонду, у тым ліку тыя, што перавышаюць вызначаныя ліміты, вяртаюцца ахвярадаўцам прапарцыйна

[3] Пастанова ЦВК ад 24.10.2024 № 82: https://rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/izb_fond_pologenie.pdf
[4] Пастанова ЦВК ад 24.10.2024 № 82, абз. 4 п. 3
[5] ВК, ч. 3 ст. 48-1
[6] ВК, ч. 2 ст. 48-1
[7] ВК, п. 11 ч. 3 ст. 48-1
[8] ВК, п. 11 ч. 3 ст. 48-1 (звесткі, якія падлягаюць указанню пры ўнясенні ахвяраванняў)

ўкладзеным сродкам цягам трох дзён з дня выбараў альбо адмовы ў рэгістрацыі кандыдата. Пасля гэтага сродкі, што засталіся на рахунках, банк пералічвае ў даход рэспубліканскага бюджэту.

Вызначаны парадак фінансавай справаздачнасці кандыдатаў аб памеры і ўсіх крыніцах стварэння выбарчага фонду, а таксама аб усіх выраблених выдатках. Аднак гарантыі празрыстасці і даступнасці для грамадства фінансавага боку выбараў адсутнічаюць.

## II. УМОВЫ АГІТАЦЫІ

### 1. Агітацыя ў СМІ

Кандыдат у прэзідэнты меў права бясплатна апублікаваць сваю перадвыбарчую праграму[9] ў друкаваных сродках масавай інфармацыі – газетах "Рэспубліка" і "Звязда". 4 студзеня праграмы апублікаваныя. Згодна з ВК,[10] праграмы публікуюцца ў парадку іх паступлення. Нягледзячы на тое, што Г. Канапацкая першая размясціла на сваім Telegram-канале перадвыбарчую праграму, у газеце "Звязда"[11] яны ідуць[12] такім чынам: А. Лукашэнка, А. Гайдукевіч, С. Сыранкоў, А. Хіжняк, Г. Канапацкая.

Агітацыя – гэта важны этап выбарчага працэсу, падчас якога кандыдаты атрымліваюць магчымасць выкласці свае перадвыбарчыя праграмы і палітычныя погляды, а таксама свае дзелавыя і асабістыя якасці, каб заваяваць любоў і падтрымку выбаршчыкаў і, пасля, перамагчы на выбарах. Аднак, аналізуючы перадвыбарчыя праграмы, складваецца ўражанне, што ў некаторых кандыдатаў няма мэты перамагчы на выбарах, пра што і заяўляецца. Напрыклад, А. Сыранкоў адзначыў, што *"ідзе на выбары не замест, а разам з прэзідэнтам Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам"*.

Падчас агітацыі свабода выказвання меркаванняў абмяжоўваецца, гэта значыць кандыдатам забараняецца прапагандаваць сацыяльную, расавую, нацыянальную, рэлігійную або моўную перавагу, якая выяўляецца ў падбухторванні да дыскрымінацыі, варожага стаўлення або гвалту. У праграмах некаторых праўладных кандыдатаў утрымліваюцца прыкметы варожасці і дыскрымінацыі. Напрыклад, кандыдат А. Сыранкоў прапануе *"ўвесці крымінальную адказнасць за прапаганду і практыку ЛГБТ"*, а таксама *"паглыбіць ачышчэнне сістэмы не толькі дзяржавы, але і ўсяго грамадства ад пярэваратняў, што займаюць адказныя пасады і гайдалі*

[9] Палажэнне аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, зацверджанае пастановай Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 20 лістапада 2024 г. № 107, п. 1: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post107-2025-red.pdf

[10] ВК, ч. 4 ст. 46

[11] Газета «Звязда», 14.01.2025, № 7 (30395): https://zviazda.by/be/pdf?page=1

[12] Газета «Звязда», 14.01.2025, № 7 (30395), с. 3-7: https://zviazda.by/sites/default/files/14stu-3.pdf, https://zviazda.by/sites/default/files/14stu-4.pdf, https://zviazda.by/sites/default/files/14stu-5.pdf, https://zviazda.by/sites/default/files/14stu-6.pdf, https://zviazda.by/sites/default/files/14stu-7.pdf

*сістэму ў 2020 годзе і сталіся, якія чакаюць паслабленняў для аднаўлення сваёй тлятворнай актыўнасці"*. А. Гайдукевіч прапануе *"на заканадаўчым узроўні абмежаваць удзел у выбарах некампетэнтных палітыкаў, здраднікаў, прадстаўнікоў пятай калоны"*. Гэта значыць падкрэслівае, што калі стане прэзідэнтам, то ўвядзе неабгрунтаваныя і дыскрымінацыйныя патрабаванні, якія абмяжоўваюць у выбарчых правах некаторыя пласты насельніцтва Беларусі.

9 і 16 студзеня былі паказаныя выступы[13] кандыдатаў у прэзідэнты на дзяржаўным тэлеканале "Беларусь 1". У перыяд з 8 па 17 студзеня прагучалі іх выступленні ў эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага Радыё.

Перадвыбарная агітацыя праходзіла ў няроўных умовах: у падтрымку А. Лукашэнкі быў задзейнічаны адміністрацыйны і прапагандысцкі рэсурс вертыкалі ўлады, праўладных грамадскіх арганізацый і дзяржаўных СМІ (гл. п. 6 ніжэй).

Агулам асвятленне гэтага этапу ў прадзяржаўных СМІ дэманструе тэндэнцыю мінімальнага інфармавання аб сутнасці асобных этапаў выбараў* з акцэнтам на арганізацыйных фармальнасцях у адсутнасць сутнаснай інфармацыі аб агітацыйнай кампаніі кандыдатаў і абмеркавання іх праграм:[14] "СМІ нагадвалі аб маючым адбыцца галасаванні і распавядалі аб выбарчай кампаніі, па сутнасці нічога пра яе не кажучы".[15]

## 2. Агітацыйныя масавыя мерапрыемствы і сустрэчы з выбаршчыкамі

Мясцовыя выканаўчыя камітэты вызначылі месцы для правядзення масавых мерапрыемстваў, памяшканні для правядзення сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі і месцы для перадвыбарных сходаў, якія арганізуюцца выбаршчыкамі.

Як і на папярэдніх выбарах*2024, масавых мерапрыемстваў зафіксавана не

[13] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Сегодня начинаются предвыборные выступления кандидатов в Президенты Беларуси по ТВ и радио*, 08.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3081

[14] Адзначаецца выразны, сістэматычны падзел роляў нацыянальных і рэгіянальных СМІ: буйныя нацыянальныя СМІ з вялікім ахопам аўдыторыі пераважна акцэнтуюць увагу на высокім узроўні арганізацыі выбараў* і працы камісій, а таксама спробах легітымізацыі працэсу з дапамогай нацыянальных і міжнародных "назіральнікаў", у той час як рэгіянальныя СМІ асвятляюць некаторыя агітацыйныя мерапрыемствы кандыдатаў у аднастайным стылі (у прыватнасці, не акцэнтуючы ўвагу на тым, хто праводзіць сустрэчу з даверанымі асобамі — і за якога кандыдата ажыццяўляецца агітацыя (гл. ніжэй). https://mediaiq.info/bezymyannye-predstaviteli-tajnogo-kandidata-o-chjom-govorit-taktika-anonimnogo-osveshheniya-vstrech-s-doverennymi-licami-kandidatov, https://mediaiq.info/nachalas-otgruzka-bjulletenej-dlya-chego-gostv-sozdajot-informacionnyj-shum-na-temu-vyborov

[15] MediaIQ, *«Началась отгрузка бюллетеней». Для чего госТВ создаёт информационный шум на тему выборов*, 21.01.2025: https://mediaiq.info/nachalas-otgruzka-bjulletenej-dlya-chego-gostv-sozdajot-informacionnyj-shum-na-temu-vyborov

было. У асноўным, праводзілі пікетаванне.[16] 16 студзеня Г. Канапацкая размясціла фота[17] з пікетаў у горадзе Мінску, якія сваёй малалікасцю адлюстроўваюць незацікаўленасць выбаршчыкаў у передвыбарнай кампаніі. 23 студзеня Г. Канапацкая апавясціла падпісчыкаў тэлеграм-канала аб маючым адбыцца пікеце, які адбыўся 24 студзеня каля гандлёва-забаўляльнага цэнтра Galleria Minsk.

Сустрэчы з выбаршчыкамі ў памяшканнях з'яўляліся найбольш тыповай формай агітацыі. Напрыклад, давераныя асобы А. Лукашэнкі выступалі ў медычных установах,[18] пра што публічна пра месца і час правядзення не паведамлялася. А. Хіжняк на сваім тэлеграм-канале публікаваў навіны пра сустрэчы пастфактум.[19] Анонсы мерапрыемстваў не асвятляліся. Г. Канапацкая апавяшчала падпісчыкаў аб маючых адбыцца сустрэчах,[20] за выключэннем сустрэч з працаўнікамі заводаў.[21]

## 3. Выраб і распаўсюджванне агітацыйнай друкаванай прадукцыі

Пры тым, што мясцовыя выканаўчыя органы вылучылі месцы для публічнага размяшчэння агітацыйных матэрыялаў у вызначаным парадку, фактычная сітуацыя з іх распаўсюджваннем працягвае агульную тэндэнцыю "ціхай" электаральнай кампаніі: у публічнай прасторы гарадоў ды іншых населеных пунктаў практычна адсутнічае сутнасная інфармацыя аб праграмах і палітычных пазіцыях кандыдатаў. Большая частка візуальных матэрыялаў у публічным полі нагадвае пра дату галасавання і заклікае грамадзян прыйсці на ўчасткі – або змяшчае інфармацыю агульнага характару аб кожным з кандыдатаў.[22] Складваецца сітуацыя візуальнай "цішыні" ў полі бачнасці грамадзян, якая выключае акцэнт на наяўнасці розных кандыдатаў і прапановах хоць нейкай альтэрнатывы А.Лукашэнку.

Звесткі аб перашкодах у вырабе і распаўсюдзе агітацыйнай прадукцыі адсутнічаюць, як і звесткі аб размяшчэнні такой прадукцыі ў не адведзеных для гэтага месцах.

---

[16] Г. Канапацкая апавясціла падпісчыкаў тэлеграм-канала аб маючым адбыцца пікетаванні https://t.me/annakanopatskaya/187, *В Могилёвской области прошли агитационные пикеты за кандидата в Президенты Республики Беларусь Олега ГАЙДУКЕВИЧА*, 6.01.2025: https://t.me/gajdukevichh/8367

[17] Ганна Канапацкая, Telegram @annakanopatskaya, *Лучшие агитационные пикеты в Минске, это когда участвуют первые лица кампаний*, 16.01.2025: https://t.me/annakanopatskaya/168

[18] https://spring96.org/be/news/117170

[19] РПТС Аляксандр Хіжняк | Рэспубліканская партыя труда і справядлівасці, Telegram @rpts_by, *Друзья, доброго дня! Короткий дайджест предвыборных встреч*, 18.01.2025: https://t.me/rpts_by/24, https://t.me/rpts_by/28

[20] Ганна Канапацкая, Telegram @annakanopatskaya, анонс сустрэчы з выбаршчыкамі ў Палацы культуры чыгуначнікаў, Сярэдняя школа № 1, 16.01.2025: https://t.me/annakanopatskaya/170

[21] Ганна Канапацкая, Telegram @annakanopatskaya, Сустрэча з работнікамі ААТ "МТЗ", 20.01.2025: https://t.me/annakanopatskaya/181

[22] Зеркало,*«Думаю, что люди сами строем пойдут». Госслужащая рассказала об атмосфере в преддверии выборов*, 20.01.2025, https://news.zerkalo.io/life/88949.html

## 4. Давераныя асобы

На сайце ЦВК ёсць даныя аб зарэгістраваных давераных асобах А. Гайдукевіча – 30 чалавек,[23] А. Лукашэнкі – 15 чалавек,[24] і Г. Канапацкай – 25 чалавек.[25] У дачыненні да давераных асобаў С. Сыранкова ды А. Хіжняка гіперспасылкі ёсць, але даныя на момант падрыхтоўкі гэтай справаздачы (25.01.2025) не адлюстроўваюцца.[26]

Параўнальна невялікая колькасць давераных асоб у А. Лукашэнкі, у ліку якіх вялікая колькасць дзяржслужачых, можа казаць пра тое, што кампанія не патрабуе традыцыйных формаў агітацыі, такіх як сустрэчы з выбаршчыкамі або агітацыя на месцах. Гэта пацвярджае гіпотэзу аб максімальным выкарыстанні адміністрацыйнага рэсурсу і мінімальных выдатках на традыцыйныя кампаніі.

Мелі месца парушэнні абмежаванняў, вызначаных для давераных асобаў: сярод давераных асобаў А. Лукашэнкі пазначаны старшыня Белтэлерадыёкампаніі ды вядучы тэлепраграмы "Клуб редакторов" Іван Эйсмант[27] і дырэктар – галоўны рэдактар Выдавецкага дома "Беларусь сегодня" Дзмітрый Жук,[28] якія працягвалі весці тэлепраграмы і ўдзельнічаць у асвятленні выбараў. Пасля накіравання скаргі, як паведамляецца,[29] Івана Эйсманта знялі з вядзення праграмы, гэтыя давераныя асобы больш не з'яўляліся ў тэлеэфіры. Пры гэтым, ні пра сам факт парушэння і скаргу, якая паступіла, ні пра наступствы для кандыдата (аж да зняцця рэгістрацыі) ЦВК не паведамляў, наадварот, 10 студзеня прэс-служба ЦВК паведаміла,[30] што *"скаргі аб парушэнні кандыдатамі ды іх даверанымі асобамі заканадаўства ў ЦВК не паступалі"*.

Асвятленне ў СМІ дзейнасці давераных асоб ажыццяўляецца ў многіх выпадках ананімна: часта не называючы як прозвішча кандыдата, так і прозвішча даверанай асобы.[31] Пры гэтым, MediaIQ адзначае, што ў

---

[23] Пастанова ЦВК ад 23.12.2024 № 135: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post135-2025.pdf

[24] Пастанова ЦВК ад 23.12.2024 № 137: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post137-2025.pdf

[25] Пастанова ЦВК ад 23.12.2024 № 139: https://rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/post139-2025.pdf

[26] Спасылка на інфармацыю аб давераных асобах С. Сыранкова: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post131-2025.pdf,
і А. Хіжняка: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post133-2025.pdf

[27] https://news.by/company/rukovodstvo/eysmont-ivan-mikhaylovich

[28] https://org.sb.by/ru/contacts/

[29] Euroradio, *Кіраўніка БТ Эйсманта знялі з тэлеэфіраў пасля скаргі блогера Малішэўскага,* 22.01.2025, https://euro.radio.fm/kiraunika-bt-eysmanta-znyali-z-teleefirau-paslya-skargi-blogera-malisheuskaga

[30] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *С 1 января начался агитационный период, который завершится 25 января.,* 10.01.2025:https://t.me/cikbelarus/3095

[31] Гомельские ведомости, *Доверенные лица кандидатов в Президенты Республики Беларусь: активные встречи с избирателями в Гомеле*, 23.01.2025, https://newsgomel.by/news/vybory-2025/doverennye-litsa-kandidatov-v-prezidenty-respubliki-belarus-aktivnye-vstrechi-s-izbiratelyami-v-gome_184575.html

"У Гомелі працягваюцца сустрэчы з даверанымі асобамі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у межах перадвыбарнай агітацыі. Гэта важная палітычная падзея прыцягвае ўвагу жыхароў горада, бо выбары Прэзідэнта – адна з ключавых падзей у жыцці краіны. На сустрэчы гамяльчане змаглі азнаёміцца з асноўнымі палажэннямі праграмы аднаго з кандыдатаў".

выпадках асвятлення актыўнасці давераных асоб па ключавых словах і трансляваных наратывах відавочна, што гаворка пра агітацыю за А. Лукашэнку.[32] Такая стратэгія дазваляе праўладным СМІ фактычна агітаваць за "дзейнага прэзідэнта", не называючы імя А. Лукашэнкі, і такім чынам фармальна выконваць забарону на агітацыю[33] і ствараць ілюзію нейтральнага асвятлення выбараў*.

### 5. Стварэнне і выкарыстанне выбарчых фондаў кандыдатамі

Паводле афіцыйнай інфармацыі[34] ўсе пяцёра кандыдатаў у прэзідэнты адкрылі спецыяльныя выбарчыя рахункі для фармавання выбарчага фонду ў перыяд з 1 па 11 лістапада 2024 г. Традыцыйна,[35] першым быў адкрыты выбарчы рахунак А. Лукашэнкі. Усе кандыдаты адкрылі выбарчыя рахункі ў банкаўскіх аддзяленнях г. Мінска.

У адсутнасць незалежных назіральнікаў і дастатковай празрыстасці працэсу паступлення і расходавання выбарчых фондаў, ажыццявіць паўнавартаснае назіранне за фінансавым бокам выбараў немагчыма.

Арыентуючыся на невялікія даныя ЦВК, намі фіксаваліся абнаўлення даных, што публікаваліся па стане на 2 снежня 2025 г. (паказаная ЦВК дата абнаўленняў – 27 лістапада 2024 г.), 23 снежня 2024 г. (паказаная ЦВК дата абнаўленняў – 11 снежня 2024 г.) і 23 студзеня 2025 г. (паказаная ЦВК дата абнаўленняў – 16 студзеня 2025 г.) наступнага характару:

---

Могилёвские ведомости, *Доверенное лицо кандидата в Президенты Республики Беларусь провел ряд встреч в Могилеве 10 января. Фото*, 11.01.2025, https://mogilevnews.by/news/11-01-2025-09-12/107062

"Давераная асоба кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь правёў 10 студзеня шэраг сустрэч з працоўнымі калектывамі горада Магілёва. Ён сустрэўся з прадстаўнікамі Магілёўскага аблспажыўсаюза, абласной клінічнай бальніцы, магілёўскіх электрычных сетак філіяла РУП "Магілёўэнерга". Падчас сустрэчы ў фармаце адкрытага дыялогу гаварылі пра бяспеку і мір, Канстытуцыю, захаванне гістарычнай памяці і важнасць удзелу ў электаральнай кампаніі".

Прыпяцкая праўда, *Доверенное лицо кандидата в Президенты провел встречу с наровлянами,* 23.01.2025, https://narovlya.by/novosti/obschestvo/doverennoe-litso-kandidata-v-prezidenty-provel-vstrechu-s-narovlyanami/

"Падчас сустрэчы жыхары райцэнтра маглі задаць пытанні, якія іх цікавяць. Мерапрыемства прайшло ў пазітыўным ключы. З залы паступіла некалькі пытанняў: аб паляпшэнні іміджу краіны на міжнароднай арэне і прыярытэтах кандыдата для краіны на бліжэйшы час. Давераная асоба адказала разгорнута, аргументаваўшы кожны тэзіс.

У завяршэнне, давераная асоба заклікала жыхароў аб'ядначацца вакол агульнай мэты — пабудовы моцнай і квітнеючай краіны.

Нараўляне выказалі падзяку за магчымасць пагутарыць і атрымаць разгорнутыя адказы на іх пытанні".

[32] MediaIQ, *Безымянные представители тайного кандидата — о чём говорит тактика анонимного освещения встреч с доверенными лицами кандидатов*, 14.01.2025, https://mediaiq.info/bezymyannye-predstaviteli-tajnogo-kandidata-o-chjom-govorit-taktika-anonimnogo-osveshheniya-vstrech-s-doverennymi-licami-kandidatov

[33] ВК, ч. 1 ст. 46 (дзяржаўныя СМІ абавязаны забяспечваць роўныя магчымасці для передвыбарных выступленняў кандыдатаў і правядзення перадвыбарнай агітацыі)

[34] Даныя Беларусбанка: https://belarusbank.by/ru/33139/41509/41530

[35] Патэрн прасочваецца ў чарговасці рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты ды іншых фармальных пералічэннях кандыдатаў.

| | 02.12.2024 | | | 23.12.2024 | | | 23.01.2025 | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Паступіла | Выкарыстана | | Паступіла | Выкарыстана | | Паступіла | Выкарыстана | |
| Лукашэнка А.Р. | 610120 | 91333,74 | 15% | 626060 | 92032,37 | 15% | 634610 | 92032,37 | 15% |
| Гайдукевіч А.С. | 3035 | 140,88 | 5% | 6470 | 140,88 | 2% | 10424,88 | 10424,88 | 100% |
| Сыранков С.А. | 11955 | 0 | 0% | 34370 | 20060,94 | 58% | 51771,51 | 30965,86 | 60% |
| Хіжняк А.М. | 2150 | 0 | 0% | 24760 | 0 | 0% | 39760 | 10080 | 25% |
| Канапацкая Г.А. | 12300 | 8000 | 65% | 19210 | 18895 | 98% | 31980 | 26637,6 | 83% |




На момант падрыхтоўкі справаздачы (24 студзеня 2025 г.) самы буйны выбарчы фонд быў сфармаваны ў А. Лукашэнкі, пры гэтым з 634610,00 руб. выдаткавана 92032,37 руб., што складае прыкладна 14,5% ад агульнай

сумы. Атрымліваецца, што ў параўнанні з іншымі кандыдатамі (сярэдні памер фонду – 33484,10 руб.) выбарчы фонд А. Лукашэнкі ў 19 разоў большы, а выдаткі застаюцца на прыкладна аднолькавым узроўні.

Пры гэтым, выдаткі ўсіх кандыдатаў істотна ніжэй вызначанага ліміту ў 420 000 руб. нават сума, выдаткаваная з фонду А. Лукашэнкі, відавочна малая для разгортвання паўнавартаснай агітацыйнай кампаніі па ўсёй краіне.

Верагодна, асноўная прычына такіх невялікіх тратаў – гэта актыўнае выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу, які дазваляе весці агітацыю без значных афіцыйных выдаткаў (гл. п. 6 ніжэй).

Вельмі нізкія сумы выбарчых фондаў, і яшчэ больш нізкія сумы тратаў іншых кандыдатаў дэманструюць адсутнасць рэальнай перадвыбарнай барацьбы. Пры гэтым, найбольш актыўна выкарыстоўваюць выбарчыя фонды А. Гайдукевіч (на 100%) і Г. Канапацкая (на 83,3%) – тыя, хто мае вопыт выбарчых кампаній, большы публічны бэкграўнд і на працягу бягучай выбарчай кампаніі больш актыўна з'яўляюцца на публіцы.

## 6. Выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу для агітацыі на карысць А. Лукашэнкі

Маніторынг усёй выбарчай кампаніі, а не толькі агітацыйнага перыяду, які штучна завужаны ў ВК тэрмінам рэгістрацыі кандыдата, і, адпаведна, у які не ўваходзіць, напрыклад, перыяд вылучэння кандыдатаў і збору подпісаў, калі фактычна ідзе актыўная агітацыя, дазваляе канстатаваць шырокае выкарыстанне рэсурсаў усяго дзяржаўнага апарату, многіх бюджэтных арганізацый і прадпрыемстваў, таксама як і лаялісцкіх, прызнаных Мінюстам тымі, што знаходзяцца ў асаблівых адносінах з дзяржавай, грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзаў для забеспячэння актыўнай інфармацыйнай кампаніі і масавай падтрымкі кандыдатуры А. Лукашэнкі.

Мы можам вылучыць некалькі механізмаў такога злоўжывання:

- выкарыстанне адміністрацыйных і інфармацыйных магчымасцяў, якія прыкладаюцца да пасады прэзідэнта, як частка агітацыйнай кампаніі;
- акцыі ў рамках "Марафону адзінства" і лозунг "Время выбрало нас!";
- кампанія (флэшмоб) "Надо!";
- інфармаванне аб выбарах у цэлым, якое выкарыстоўваецца для схаванай агітацыі;
- сустрэчы давераных асоб кандыдата А. Лукашэнкі, многія з якіх з'яўляюцца службовымі асобамі высокага ўзроўню, з працоўнымі калектывамі дзяржаўных прадпрыемстваў ды ўстаноў.

### *6.1 Выкарыстанне адміністрацыйных ды інфармацыйных магчымасцяў, якія прыкладаюцца да пасады прэзідэнта, як частка агітацыйнай кампаніі*

Згодна з артыкулам 77 ВК, зарэгістраваныя кандыдаты ў прэзідэнты вызваляюцца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў з дня рэгістрацыі да дня выбараў з прадастаўленнем сацыяльнага адпачынку. З аднаго боку – гэта гарантыя магчымасці кандыдата весці кампанію, але гэта таксама і гарантыя ад злоўжывання сваёй пасадай для мэтаў агітацыі. ВК робіць выключэнне з гэтага патрабавання для прэзідэнта, які балатуецца на новы тэрмін. Карыстаючыся гэтым выключэннем, А. Лукашэнка актыўна выкарыстоўвае перавагі статусу дзеючага прэзідэнта, які ім утрымліваецца, для агітацыі.

А. Лукашэнка наўпрост заявіў на сустрэчы сваім даверанымі асобам, што на агітацыйным этапе электаральнай кампаніі *"...вы будзеце галоўнымі дзеючымі асобамі. Шчыра кажучы, у мяне проста на гэта не будзе часу"* патлумачыўшы, што яго працоўны графік у студзені будзе насычаны традыцыйнымі мерапрыемствамі.[36]

У перыяд агітацыі ***адсутнічала выразна пэўная мяжа паміж адпраўленнем функцый прэзідэнта і перадвыбарнымі мерапрыемствамі***: А. Лукашэнка працягвае свае звычайныя паездкі – сустрэчы – публічныя выступы, якія становяцца цэнтрам навінавых выпускаў СМІ. Згаданая вышэй сустрэча добра ілюструе ўсю кампанію: А. Лукашэнка сустракаецца са сваімі даверанымі асобамі, частка з іх – яго падначаленыя, сустрэча асвятляецца ў СМІ,[37] у матэрыяле яго называюць *"кіраўніком дзяржавы", "прэзідэнтам"*, і ні разу – *"кандыдатам у прэзідэнты"*. А. Лукашэнка ўперамешку ставіць перад імі задачы, якія вынікаюць з дзяржаўнай функцыі і задачы на выбарчую кампанію. Больш за тое, на гэтай жа "сустрэчы з даверанымі асобамі" кандыдат у прэзідэнты аддае распараджэнні ЦВК: *"паводле словаў прэзідэнта, таксама неабходна вызначыцца з запрашэннем на выбары заходніх назіральнікаў". "Трэба з Цэнтральнай камісіяй яшчэ раз сустрэцца і вызначыцца, ці будзем мы запрашаць гэтых замежнікаў* (заходніх назіральнікаў. – Заўв. БЕЛТА) *на выбары".*[38]

---

[36] Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь, *Встреча с доверенными лицами*, 03.01.2025, https://president.gov.by/ru/events/vstreca-s-doverennymi-licami

[37] БелТА, *Что самое страшное для Президента и почему выборы в Беларуси - не шоу? О чем говорил Лукашенко с доверенными лицами*, 03.01.2025: https://belta.by/president/view/chto-samoe-strashnoe-dlja-prezidenta-i-pochemu-vybory-v-belarusi-ne-shou-o-chem-govoril-lukashenko-s-686709-2025/

БелТА, *"Главное - не агитация, а обратная связь от народа". Лукашенко провел встречу с доверенными лицами*, 03.01.2025: https://belta.by/president/view/glavnoe-ne-agitatsija-a-obratnaja-svjaz-ot-naroda-lukashenko-provel-vstrechu-s-doverennymi-litsami-686669-2025/

[38] БелТА, *Что самое страшное для Президента и почему выборы в Беларуси - не шоу? О чем говорил Лукашенко с доверенными лицами*, 03.01.2025: https://belta.by/president/view/chto-samoe-strashnoe-dlja-prezidenta-i-pochemu-vybory-v-belarusi-ne-shou-o-chem-govoril-lukashenko-s-686709-2025/

Тое, што можна было б назваць сустрэчамі з выбаршчыкамі (як формы агітацыі) – напрыклад, наведванне заводаў, пераплецена з дакладамі чыноўнікаў (відавочнае адпраўленне дзяржаўных функцый). Інфармацыя пра такія мерапрыемствы публікуецца не толькі прэс-службай прэзідэнта (у Telegram-канале "Пул первого", на афіцыйным сайце[39]), але і дзяржаўнымі СМІ,[40] а таксама перадрукоўваецца на навінавых стужках дзяржаўных органаў.[41] Пры гэтым амаль на ўсіх заводах А. Лукашэнкі ўручалі падарункі: на Мотавелазаводзе – матацыкл,[42] на Мінскім аўтамабільным заводзе (МАЗ) – сякеру і аўтобус.[43] Гэтыя сустрэчы рэзка кантрастуюць з сітуацыяй пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, калі падчас выступу А. Лукашэнкі на Мінскім заводзе колавых цягачоў (МЗКЦ) частка прысутных выказала нязгоду з яго пазіцыяй і заклікала да яго адстаўкі.[44]

7 студзеня А. Лукашэнка выправіўся святкаваць Каляды ў храм Свяціцеля Мікалая Цудатворцы, дзе фактычна правёў агітацыйнае мерапрыемства,[45] агучыўшы вытрымкі са сваёй перадвыбарнай праграмы парафіянам і святарам.

10 студзеня 2025 г. з працэдуры пуску артэзіянскай вады ў горадзе Мінску (рэалізацыя дзяржаўных функцый) было зроблена шоу са спецэфектамі[46] (у духу перадвыбарных яркіх малюнкаў) з актыўным асвятленнем ва ўсіх СМІ; А. Лукашэнку падарылі капсулу з артэзіянскай вадой.[47]

---

[39] Напрыклад: Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь, *Посещение Минского автозавода,* 21.01.2025: https://president.gov.by/ru/media/details/posesenie-minskogo-avtozavoda

[40] Газета «Звязда», 22.01.2025, № 13 (30401), с. 1: https://zviazda.by/sites/default/files/22stu-1-szhatyy.pdf

[41] Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт, *Лукашенко посетил новое автобусное производство МАЗа*, 22.01.2025: https://glubokoe.vitebsk-region.gov.by/ru/news_republic_ru/view/lukashenko-posetil-novoe-avtobusnoe-proizvodstvo-maza-26714/

[42] Пул Первого, Telegram @pul_1, *Первому подарили первый мотоцикл, произведенный на новых модернизированных линиях*, 16.01.2025: https://t.me/pul_1/15251

[43] Пул Первого, Telegram @pul_1, *Топор, который сделали и передали Президенту молодые ребята из минского автомеханического колледжа,* 22.01.2025: https://t.me/pul_1/15331, *Первому подарили автобус. Первый за подарок поблагодарил и сразу поручил передать его государственному учреждению образования «Социально-педагогический центр с приютом Заводского района г. Минска»*, 21.01.2025: https://t.me/pul_1/15314

[44] Meduza, *Лукашенко на заводе тягачей в Минске выступил, пожалуй, со своей самой провальной речью. Мы поговорили с рабочими этого предприятия о том, что там происходило*, 17.08.2020 https://meduza.io/feature/2020/08/17/lukashenko-na-zavode-tyagachey-v-minske-vystupil-pozhaluy-so-svoey-samoy-provalnoy-rechyu-my-pogovorili-s-rabochimi-etogo-predpriyatiya-o-tom-chto-tam-proishodilo

[45] Пул Первого, Telegram @pul_1, *В это праздничное утро Первый едет в Логойск,* 07.01.2025: https://t.me/pul_1/15113, *Будет сделано всё, чтобы в Беларуси сохранился мир. Будем жить, может, небогато, но достойно*, 07.01.2025: https://t.me/pul_1/15117, *30 лет назад я поклялся, что буду служить своему народу. И я это делаю*, 7.01.2025 https://t.me/pul_1/15118

[46] Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь, *Участие в торжественном пуске артезианской воды из подземных источников для обеспечения водоснабжения Минска | Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь,* 10.01.2025: https://president.gov.by/ru/media/details/ucastie-v-torzestvennom-puske-artezianskoj-vody-iz-podzemnyh-istocnikov-dla-obespecenia-vodosnabzenia-minska

[47] Пул Первого, Telegram @pul_1, *Вода - единственный напиток мудрого человека*, 10.01.2025: https://t.me/pul_1/15164

У перыяд агітацыйнай кампаніі, А. Лукашэнка абвясціў аб традыцыйным[48] перад выбарамі рашэнні[49] вырабіць пераразлік працоўных пенсій з 1 лютага 2025 г. шляхам карэкціроўкі фактычнага заробку пенсіянераў зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы, ужытай у час папярэдняга пераразліку пенсій, з павышэннем яе велічыні на 10 працэнтаў. Такія захады заахвочвання, прынятыя падчас выбарчай кампаніі, могуць разглядацца як выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу і, магчыма, подкуп выбаршчыкаў.

Асобна варта паказаць на выкарыстанне рэсурсаў прэс-службы прэзідэнта (і асабліва Telegram-канала "Пул первого" і афіцыйнага сайта прэзідэнта) для мэтаў шырокага распаўсюджвання інфармацыі, у тым ліку і пра тую, што відавочна адносіцца да дзейнасці А. Лукашэнкі як кандыдата (напрыклад, сустрэчы з даверанымі асобамі[50]).

Прэс-служба А. Лукашэнкі 20 студзеня прэзентавала кнігу "Наш Президент", якая з'яўляецца біяграфіяй з фотаздымкамі яго сям'і, "залікоўкі студэнта Лукашэнкі ды яго характарыстыка і нават рукапісныя матэрыялы Першага, падрыхтаваныя да важных падзей".[51] Старт продажаў пачаўся а 15:00, пра што было паведамлена а 15:00[52] 20 студзеня, гэта значыць у момант пачатку рэалізацыі кнігі. А 19:05 прэс-служба заявіла,[53] што стартавы наклад кнігі распрададзены, паказаўшы, што гэта чарговы прыклад невычэрпнай цікавасці да "першага" і ўсяго, што з ім звязана. Памер накладу не паведамляўся.

Таксама, пад выглядам нейтральнага заклiку прагаласаваць на выбарах*2025 у першы раз маладым выбаршчыкам БРСМ, а таксама дзяржаўнымі СНУ ды ВНУ запушчана кампанія з лозунгамі "Мой голос – первый!"[54] ды "Твой голос первый!",[55] якія абыгрываюць назву А.

---

"Першаму падзякавалі за падтрымку і падарылі сімвалічны падарунак - капсулу з вадой з артэзіянскай свідравіны".

[48] У перыяд выбарчай кампаніі 2020 пенсіі павялічыліся на 6% шляхам падпісання А. Лукашэнкам Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2020 г. № 232 "Аб павышэнні пенсій", Праваабаронцы за свабодныя выбары, Выніковая аналітычная Справаздача па выніках назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2020 года, ст. 28: https://spring96.org/be/news/98939

[49] Пул Первого, Telegram @pul_1, *Президент Беларуси 20 января подписал Указ "О повышении пенсий"*, 20.01.2025: https://t.me/pul_1/15293

[50] Пул Первого, Telegram @pul_1, *Первый рассказал, что будет главным в работе доверенных лиц*, 03.01.2025: https://t.me/pul_1/15065

[51] Пул Первого, Telegram @pul_1, *В какой еще книге вы сможете не только прочитать про Первого, но еще и получить копии из президентских архивов?!*, 20.01.2025: https://t.me/pul_1/15290

[52] Пул Первого, Telegram @pul_1, *Купить книгу можно будет уже сегодня! В магазине «Светоч» и магазинах «Первый». Старт продаж 15:00*, 20.01.2025: https://t.me/pul_1/15289

[53] Пул Первого, Telegram @pul_1, 20.01.2025: https://t.me/pul_1/15297

[54] Брэсцкі дзяржаўны каледж сувязі, *Мой голос первый!,* 21.01.2025: https://bgks.by/moj-golos-pervyj/
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, *Мой голос - первый!*, 21.01.2024: https://www.mslu.by/news/moy-golos-pervyy/

[55] Лунінецкія навіны, *«Твой голос первый!». На выборах Президента Республики Беларусь голосует молодёжь*, 22.01.2025: https://lnc.by/news/mikashevichy/tvoy-golos-pervyy-na-vyborakh-prezidenta-respubliki-belarus-golosuet-molodyezh/

Лукашэнкі "першым" у рыторыцы дзяржСМІ і прэзідэнцкай прэс-службы. Відэа-ролікі ў сацсетках, якія транслююць гэтыя лозунгі, таксама паўтараюць стандартныя наратывы А. Лукашэнкі, напрыклад "За росквіт нашай краіны", "За Беларусь" і г. д.[56]

### *6.2 Акцыі ў межах "Марафону адзінства" і лозунг “Время выбрало нас!”*

З 17 верасня 2024 г. па ўсёй краіне праходзяць выставы, мерапрыемствы і канцэрты ў рамках акцыі "Марафону адзінства" (як указваецца, ініцыяванай А. Лукашэнкам[57]). Працоўную групу па падрыхтоўцы да марафону ўзначальвае нявестка — Ганна Лукашэнка; у гэтай працы задзейнічаны медыяхолдынг "Музыкальная медиакомпания", які звязаны з сям'ёй Аляксандра Лукашэнкі.[58] Канцэрты ў рамках гэтага марафону пад назвай "Время выбрало нас!" праходзяць у рэгіёнах Беларусі з верасня 2024 года.[59] "Марафон адзінства" завяршыўся 24 студзеня 2025 года — фіналам акцыі стаў аднайменны гала-канцэрт у "Мінск-Арэне" і сабраў больш за 10 тысяч гледачоў у прысутнасці А. Лукашэнкі.[60] Прамую трансляцыю вёў дзяржаўны тэлеканал "Беларусь 1". Паводле ацэнак незалежных крыніц (на падставе даных аб дзяржаўных закупках) агульная сума выдаткаў на гэты марафон перавышае адзнаку ў 3,5 млн рублёў.[61]

Лозунг "Время выбрало нас!" актыўна тыражаваўся праўладнымі СМІ вясной 2024 года, бо ён быў абраны дэвізам VII Усебеларускага народнага сходу (24-25 красавіка 2024 г.).[62]

На дзяржаўным тэлеканале "Беларусь 1" з 19 лістапада 2024 г. па 23 студзеня 2025 г. кожны дзень (!) у прайм-тайм (21:30) выходзяць

---

[56] БРСМ факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, Instagram @brsm.fno_, 22.01.2025: https://www.instagram.com/brsm.fno_/reel/DFIuuy2IJhr/

Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, TikTok @vstu_vitebsk, 21.01.2025: https://www.tiktok.com/@vstu_vitebsk/video/7462387285678476550

[57] СТВ, Прямую трансляцию гала-концерта «Время выбрало нас» покажет телеканал «Беларусь 1», 24.01.2025: https://ctv.by/news/obshestvo/pryamuyu-translyaciyu-gala-koncerta-vremya-vybralo-nas-pokazhet-telekanal-belarus-1

[58] Зеркало, *«Бюро»: Как Анна Лукашенко досрочно агитирует за свекра за деньги налогоплательщиков, как привлекают блогеров и что об этом (не) говорят в ЦИК*, 16.01.2025, https://news.zerkalo.io/economics/88640.html?c

[59] СТВ, *Прямую трансляцию гала-концерта «Время выбрало нас» покажет телеканал «Беларусь 1»*, 24.01.2025: https://ctv.by/news/obshestvo/pryamuyu-translyaciyu-gala-koncerta-vremya-vybralo-nas-pokazhet-telekanal-belarus-1

[60] СТВ, *10 тысяч зрителей в «Минск-Арене» – масштабный гала-концерт стал финальной точкой «Марафона единства»*, 24.01.2025: https://ctv.by/news/obshestvo/10-tysyach-zritelej-v-minsk-arene-masshtabnyj-gala-koncert-stal-finalnoj-tochkoj-marafona-edinstva

[61] Зеркало, *Беларусов все сложнее удивить, но эта цифра явно может — выяснили, сколько денег взяли из госбюджета на акции, где восхваляют Лукашенко*, 24.01.2025, https://news.zerkalo.io/economics/89410.html?c

[62] БелТА, *Время выбрало нас! Всебелорусское народное собрание пройдет 24-25 апреля во Дворце Республики*, 24.01.2025, https://belta.by/society/view/vremja-vybralo-nas-vsebelorusskoe-narodnoe-sobranie-projdet-24-25-aprelja-vo-dvortse-respubliki-629923-2024/

паўтарагадзінныя серыі "гістарычнага" праекта "Время выбрало нас!",[63] прысвечанага найноўшай гісторыі незалежнай Беларусі, увесь наратыў якога зводзіцца да найважнейшай ролі А. Лукашэнкі ўсюды.

А 3 студзеня 2025 публікуецца перадвыбарная праграма а. Лукашэнкі, якая называецца "Время выбрало нас!».[64]

Такім чынам гэты лозунг агучваецца дзяржаўнымі СМІ ўвесь 2024. У непасрэдна перадвыбарчы перыяд 19 лістапада — 23 студзеня кожны дзень па Першым канале дэманструецца фактычна 1,5 гадзінны ролік пра А. Лукашэнку ў розныя гістарычныя перыяды яго "прэзідэнцтва", а 24 студзеня – вялікі гала-канцэрт пад тым жа лозунгам.

### *6.3 Кампанія (флэшмоб) «Надо!»*

Іншы лозунг, які асацыюецца з выбарчай кампаніяй А. Лукашэнкі – "Надо!". Паводле афіцыйнай версіі[65] ён паўстаў як рэакцыя на словы А. Лукашэнкі падчас інтэрв'ю журналістцы ВГТРК В. Скабеевай, 23 кастрычніка 2024 года (адказваючы на пытанне пра намер узяць удзел у будучых выбарах): *"калі вось Эйсмант і прыхільнікі мае скажуць, што гэта трэба"*.

Напрыканцы кастрычніка 2024 г. пачаўся флэшмоб "Надо!", сутнасць якога складаецца ў апублікаванні ў розных фарматах (у тым ліку калектыўных відэа) заклікаў да А. Лукашэнкі ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах*2025. У флэшмобе ўдзельнічалі[66] дзяржаўныя служачыя, супрацоўнікі дзяржаўных і бюджэтных арганізацый і прадпрыемстваў, грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзаў.[67] Ёсць шмат сведчанняў пра ціск і прымус да ўдзелу ў здымках.[68] А. Лукашэнка крывадушна падкрэслівае стыхійны, нізавы характар гэтай ініцыятывы: *"Я рады гэтаму. Калі гэта такое ўсеагульнае ўхваленне. Але не дай бог гэта арганізаванае нешта"*.[69]

Далей лозунг "Надо!" выкарыстоўваўся ў візуальным афармленні пікетаў па зборы подпісаў за А. Лукашэнку.[70] Пасля рэгістрацыі, працягнулася

---

[63] News.By, *Время выбрало нас*: https://news.by/videogallery/khronikalno-dokumentalnye/vremya-vybralo-nas?page=1,
https://news.by/videogallery/khronikalno-dokumentalnye/vremya-vybralo-nas?page=4

[64] Газета «Звязда», 14.01.2025, № 7 (30395), с. 3: https://zviazda.by/sites/default/files/14stu-3.pdf

[65] Беларусь Сегодня, *Что в основе самого консолидирующего флешмоба Беларуси. Надо*, 02.11.2024: https://www.sb.by/articles/nado.html

[66] Комсомольская правда, *«Если сторонники мои скажут, что это надо...» Белорусы записывают видео со словом «Надо!» в ответ на слова Лукашенко об участии в выборах президента в 2025 году*, 28.10.2024: https://www.belarus.kp.ru/daily/27652/5003775/

[67] Беларускі прафесійны саюз работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, *Профсоюзы говорят: «Надо!»*, 29.10.2024, https://kult.1prof.by/news/no-category/profsoyuzy-govoryat-nado/

[68] Зеркало, *Власти запустили флешмоб: работников госорганизаций и военных заставляют просить Лукашенко баллотироваться на 7-й срок,* 28.10.2024, https://news.zerkalo.io/cellar/81933.html?c

[69] БелТА, *Лукашенко рассказал о своей реакции на флешмоб «Надо!»,* 03.11.2024 : https://belta.by/president/view/lukashenko-rasskazal-o-svoej-reaktsii-na-fleshmob-nado-673001-2024/

[70] Аб'яднаная галіновая прафсаюзная арганізацыя працаўнікоў НАН Беларусі, *Начался сбор подписей для выдвижения кандидатов в Президенты Республики Беларусь:* https://profnan.by/nachalsya-sbor-podpisej-dlya-vydvizheniya-kandidatov-v-prezidenty-respubliki-belarus/

дваістае пазіцыянаванне гэтага лозунга: нізавы флэшмоб і яго ўжыванне ў айдэнтыцы кампаніі А. Лукашэнка дазваляе бескантрольна выкарыстоўваць рэсурсы многіх арганізацый. Так, БРСМ запусціў стыкерпакі,[71] якія агітуюць галасаваць за А. Лукашэнку: *"Только вместе! Только вперёд! Только с батькой!", "Любимую не отдают!", "Надо!"*. І далей навіна аб гэтай падзеі публікуецца, напрыклад, мясцовай газетай "Бярэзінская панарама".[72]

### *6.4 Інфармаванне аб выбарах агулам, якое выкарыстоўваецца для схаванай агітацыі*

16 студзеня 2025 г. прайшоў адзіны дзень інфармавання на тэму: *"Удзел у выбарах – права і грамадзянскі абавязак кожнага"*, якая раскрываецца не толькі праз асвету аб выбарчых правах, але і дае магчымасць для схаванай і прамой агітацыі. На сайтах мясцовых выканаўчых камітэтаў размяшчаліся навіны аб мінулых мерапрыемствах на тэму выбараў прэзідэнта, якія ў асноўным праводзілі дзяржаўныя служачыя. Часты наратыў спікераў – слушнасць абранага 30 гадоў таму курсу.[73]

Сустракаюцца і сітуацыі схаванай агітацыі за А. Лукашэнку. Напрыклад, памочнік прэзідэнта – інспектар па Віцебскай вобласці Сяргей Ляўковіч,[74] заявіў: *"Часта наведваю розныя прадпрыемствы, арганізацыі, маю зносіны з чальцамі калектываў. Прыемна, што людзі падтрымліваюць цяперашні курс Беларусі, з'яднаўшыся вакол нацыянальнага лідара, цэняць тое, што мы жывем у мірнай краіне"*. Начальнік упраўлення спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Новікаў[75] прыйшоў да высновы, што *"бягучыя сацыялагічныя даследаванні адназначна кажуць аб падтрымцы пераважнай большасцю цяперашняга курсу. Вынікі сацапытанняў пацвярджаюць поўны давер да кіраўніка дзяржавы, дзяржаўных органаў і адлюстроўваюць вынікі пяці гадоў працы дзяржаўнай улады"*.

---

[71] БРСМ, *"Молодежь голосует!" Тематический стикерпак запущен в Telegram,* 21.01.2025: https://www.brsm.by/ru/patriotic-news-ru/view/molodezh-golosuet-tematicheskij-stikerpak-zapuschen-v-telegram-26109-2025/

[72] Бярэзінская панарама, *"Молодежь голосует!" Тематический стикерпак запущен в Telegram,* 22.01.2025: https://berezino.by/ru/novosti/aktualnye-novosti/item/35845-molodezh-golosuet-tematicheskij-stikerpak-zapushchen-v-telegram

[73] Бабруйскі гарадскі выканаўчы камітэт, *Выбор каждого. Единый день информирования с участием Игоря Киселя прошел в троллейбусном парке,* 17.01.2025: https://bobruisk.gov.by/news/gorodskie-novosti/vybor-kazhdogo-edinyy-den-informirovaniya-s-uchastiem-igorya-kiselya-proshel

[74] Пастаўскі край, *16 января Поставы посетил инспектор по Витебской области Сергей Левкович*, 16.01.2025: https://www.postawy.by/2025/01/16-janvarja-postavy-posetil-inspektor-po-vitebskoj-oblasti-sergej-levkovich/

[75] Бабруйскі гарадскі выканаўчы камітэт, *Сергей Новиков: «Воля белорусского народа – единственная легитимная сила, которая может и должна выбирать судьбу государства»*, 17.01.2025: https://bobruisk.gov.by/news/gorodskie-novosti/sergey-novikov-volya-belorusskogo-naroda-edinstvennaya-legitimnaya-sila

Іншыя праводзілі прамую агітацыю. Напрыклад, у справаздачы з Акадэміі кіравання наўпрост цытуюцца словы рэктара, які фактычна заклікае галасаваць за А. Лукашэнку.[76] Старшыня Лідскага райвыканкама Аляксандр Вярсоцкі, выступаючы перад медыкамі ў Лідскай цэнтральнай раённай лякарні,[77] заявіў пра важнасць голасу кожнага беларуса і распавёў, што трэба зрабіць, каб *"захаваць нашу выбудаваную за апошнія 30 гадоў, суверэнную і незалежную дзяржаву для народа"*, агучыў фактары моцнай дзяржавы, адзін з якіх – моцная ўлада, якая асацыюецца з *"прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам"*. Аднак падкрэсліў, што не агітуе галасаваць за таго ці іншага кандыдата, бо ўсе людзі, якія сабраліся, разумныя і самі могуць зрабіць выбар. Яго просьба толькі аб тым, каб выбар быў удумлівым, аналітычным і з поўнай доляй адказнасці за будучыню.

## III. НАЗІРАЛЬНЫ САВЕТ ПА СМІ

Як і ў папярэдніх кампаніях, пастановай №104 ад 20 лістапада 2024 г. ЦВК стварыла Назіральны савет па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення передвыбарнай агітацыі ў СМІ (Савет). Рэгуляванне складу Савета, працэдуры яго фармавання, спынення паўнамоцтваў яго чальцоў застаюцца нязменнымі і, як мы адзначалі раней,[78] не могуць гарантаваць незалежнасць дадзенага органа. Назіральны савет заклікан кантраляваць выкананне рэдакцыямі СМІ Выбарчага кодэкса, Закона "Аб сродках масавай інфармацыі" ды іншых актаў заканадаўства, забеспячэнне роўных магчымасцяў для перадвыбарнай агітацыі, уключна з вызначэннем рэдакцыямі СМІ, уладальнікамі інтэрнэт-рэсурсаў адзіных для ўсіх кандыдатаў памеру і ўмоў аплаты платформаў для агітацыі, а таксама разглядаць спрэчкі аб парушэннях парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў паводле зваротаў кандыдатаў у дэпутаты, іх давераных асоб.[79] Пастанова прадугледжвае магчымасць прысутнічаць на пасяджэннях Назіральнага савета для чальцоў ЦВК, работнікаў яе апарата ды "іншых асоб, запрошаных на пасяджэнне".[80]

Нягледзячы на тое, што ў тэксце пастановы змяшчаецца спасылка на дадатак, які ўдакладняе склад Савета, апублікаваны ЦВК дакумент звестак

[76] Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, *Участие в выборах – право и гражданский долг каждого. В Президентской Академии прошел Единый день информирования,* 16.01.2025: https://www.pac.by/press-center/news/uchastie-v-viborah-pravo-i-grazhdanskii-dolg-kazhdogo/

[77] Лідскі раённы выканаўчы камітэт, *Александр Версоцкий встретился с коллективом Лидской ЦРБ | Новости района,* 24.01.2025: https://lida.gov.by/ru/lida-news-ru/view/aleksandr-versotskij-vstretilsja-s-kollektivom-lidskoj-tsrb-25554-2025/

[78] *Выбары*2024. Аналітычная справаздача па выніках назірання за перадвыбарнай агітацыяй,* ст. 15: https://spring96.org/files/misc/spravazdacha_agitacyja3_bel.pdf

[79] Пастанова ЦВК ад 20.11.2024 №104, п. 4: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post104-2025.pdf.

[80] Пастанова ЦВК ад 20.11.2024 №104 п. 2: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post104-2025.pdf.

аб складзе не ўтрымлівае.[81] У іншых адкрытых крыніцах інфармацыя аб складзе Савета ды абнаўляльная інфармацыя аб яго дзейнасці, спрэчках, перададзеных на яго разгляд, таксама адсутнічае. У тэлеграм-канале ЦВК апублікаваныя 3 інфармацыйныя нататкі, якія тычацца Наглядальнага савета (аб парадку пасяджэння ЦВК,[82] аб фармаванні Савета — без пайменнага ўказання складу, аб адным пасяджэнні Савета).[83]

Паводле інфармацыі ЦВК, 23 студзеня Назіральны савет правёў пасяджэнне з удзелам прадстаўніка ЦВК,[84] у сувязі з тым, што газеты "Мінская праўда" і "7 дней, 22 і 23 студзеня апублікавалі апытанні грамадскай думкі, звязаныя з выбарамі, у парушэнне патрабаванняў арт. 46 ВК.[85] Друкаваным СМІ вынесеныя папярэджанні.

[81] Пастанова ЦВК ад 20.11.2024 №104: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post104-2025.pdf
[82] ЦВК, Telegram @cikbelarus, 16.11.2024: https://t.me/cikbelarus/2872
[83] ЦВК, Telegram @cikbelarus, 25.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3259
[84] ЦВК, Telegram @cikbelarus, 25.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3259
[85] ВК, ч. 12 ст. 46 (на працягу апошніх пяці дзён да выбараў, рэферэндуму не дапускаюцца апублікаванне, размяшчэнне ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт вынікаў апытанняў грамадскай думкі, звязаных з выбарамі, рэферэндумам, прагнозам іх вынікаў)